УДК 398.87(476-15):94(470”1924/1958”)

# РЭПРАДУКЦЫЯ СЮЖЭТУ ЧАСОЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ Ў НАРОДНАПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСІ

***Настасся Гулак***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь*

Прааналізавана сюжэтная традыцыя беларускай партызанскай песні часоў Другой сусветнай вайны “Чайка”. Даказана, што яна з’яўляецца ўстойліва засвоеным запазычаннем з рускай народнапесеннай традыцыі, сфарміраванай на Далекім Усходзе ў 1920-я гг. Рэпрэзентацыя песні ў фалькларыстычных зборніках указвае на дынаміку сюжэта ў бок лірычнага пачатку і на прымяненне ў савецкай навуцы ідэалагізаваных падыходаў пры публікацыі фальклору вайны

***Ключавыя словы: фалькларыстыка, песня, Другая сусветная вайна, грамадзянская вайна, Далёкі Усход, чайка***

Фонды фальклорных матэрыялаў, звязаных з падзеямі Другой сусветнай вайны, як адзначаюць В. Гусеў, В. Крупянская, С. Мінц, І. Беразоўскі, А. Сойманаў, В. Сакалова, А. Фядосік, пачалі фарміравацца непасрэдна ў час вайны, калі навуковыя ўстановы Масквы і Ленінграда, а пазней і саюзных рэспублік, разгарнулі актыўную збіральніцкую працу. У трактоўках савецкіх вучоных новыя факты народнай творчасці, якія назапашваліся даволі інтэнсіўна, адразу паслядоўна адмяжоўваліся ад уласна традыцыйнай народнай культуры. Практычна з першых абагульняючых прац па народнапесеннай традыцыі часоў вайны сцвердзілася пазіцыя, паводле якой, паняцце фальклор вайны пашырылася за кошт уключэння ў яго твораў прафесійных паэтаў і самадзейных аўтараў, шматлікіх пераробак і пералажэнняў, перадрукоўвак матэрыялаў франтавых выданняў і інш., і разглядалася як народная творчасць новай фармацыі.

Такая трактоўка заставалася працоўнай практычна да 1970-х гг., калі канцэптуальнае асэнсаванне паняцця савецкі фальклор Вялікай Айчыннай вайны пачало фарміравацца на новым тэарэтычным узроўні. Было сцверджана, што ён увасобіў масавы калектыўны пачатак, замацаваны ў шырокім коле наратыўных крыніц і ў тэкставай традыцыі, і займае асаблівае месца на мяжы фальклору, самадзейнай творчасці і масавай культуры. У 1980 г.

В. Гусеў ставіў задачу даследавання мастацкіх стыляў фальклору Другой сусветнай вайны, абгрунтоўваючы тым, што народная творчасць гэтага перыяду генетычна ўзыходзіць да розных крыніц, як фальклорных, так і нефальклорных, сярод якіх традыцыйная народная лірыка, балада, казачны эпас і няказкавая проза, гарадскі раманс, салдацкая песня, песні літаратурнага паходжання і інш. [1, с. 7–8].

Развіццё навуковага дыскурса аб народнай творчасці ваеннага часу паказала, што найчасцей аб’ектам даследавання фалькларыстаў рабіліся народныя пералажэнні савецкай масавай песні. Гэта абумоўлена выразнай пазнавальнасцю падобнага матэрыялу ў масіве зафіксаваных тэкстаў, яго “ідэалагічна пазітыўным статусам” і магчымасцю інтэрпрэтацыі ў рэчышчы ідэйных задач савецкай фалькларыстыкі.

Значна менш распрацаванымі ў беларускай гуманітарыстыцы засталіся такія сегменты фальклору часоў вайны, як самадзейная аўтарская песня[21] і традыцыйнанародная лірыка. Фрагментарана пра традыцыйную лірычную песню ў рэпертуары беларускіх партызан вайну паведамлялі ў сваіх працах М. Грынблат і Л. Мухарынская. Праблемнае поле ўзаемадзеяння класічнай фальклорнай спадчыны і новых з’яў у духоўнай культуры народа акрэсліла Г. Барташэвіч, якая, аналізуючы

[21] Гэтай тэме прысвечаны працы Л. Мухарынскай (1964, 1968), некаторыя звесткі даюцца ў артыкуле Г. Барташэвіч (1969) і інш.

матэрыялы першых пасляваенных экспедыцый, указала найбольш пашыраныя беларускія, украінскія і рускія народныя лірычныя песні, што бытавалі як партызанскія.

Прадметам гэтага даследавання служыць сюжэтны інварыянт лірычнай песні пра смерць партызанаў, вядомы пад назвай "Над возерам чаечка ўецца" (далей – "Чайка"), варыянты якога былі распаўсюджаны ў рэпертуары партызанскіх атрадаў і злучэнняў Беларусі [2, с. 103–104]. У працэсе работы над тэмай было выяўлена пяць апублікаваных у перыяд з 1924 па 1958 гг. тэкстаў і знойдзены ў фондах БДАМЛМ тэкст "Чайкі", запісаны Л. Мухарынскай у экспедыцыі 1949 г. Адразу адзначым, што паводле жанравай прыроды названая песня не разглядаецца разам з такімі ўзорамі народнай лірыкі як "У саду пры даліне", "Каліна-маліна, чаго ў лузе стаіш?", "Ой пад гаем зяляненькім" і інш. Яна акрэсліваецца як устойліва засвоенае запазычанне з познетрадыцыйнай рускай народнапесеннай традыцыі.

Найбольш раннюю ўзгадку пра "Чайку" знаходзім у працы савецкага музыказнаўцы, даследчыка рускай рэвалюцыйнай паэзіі М. Друскіна. Першая публікацыя гэтай партызанскай песні датуецца 1926 г. (часопіс "Сибирская живая старина") [3, с. 219] і належыць А. Паповай, якая вывучала факты вуснай гісторыі і фальклор часоў грамадзянскай вайны ў Забайкаллі. У прыватнасці, у Верхняудзінскім22 павеце яна даследавала стыхійнае апалчэнне мясцовага насельніцтва стараабрадцаў Забайкалля – сямейскіх23 – супроць атрадаў белагвардзейскіх генералаў Сяменава24 і фон Унгерна. У 1920 г. апалчэнне ў Забайкаллі сфарміравалася ў партызанскі рух.

Экспедыцыі 1924–1925 гг., у якіх брала ўдзел А. Папова, былі арганізаваны найстарэйшай музейнай установай Сібіры – Іркуцкім Дзяржаўным Навуковым музеем і Усходне-Сібірскім аддзелам РГТ. У тым, што Іркуцк ў 1920-я гг. зрабіўся буйным цэнтрам фальклорна-этнаграфічных даследаванняў Усходне-Сібірскага рэгіёну РСФСР значную ролю адыграла навуковая, арганізатарская і выдавецкая дзейнасць М. Азадоўскага.25 Разам з Ю. Сакаловым і Г. Астахавай М. Азадоўскі пазней стане вядучым фалькларыстам сталінскай эпохі. Пры ацэнцы "дасягненняў" гуманітарнай навукі гэтага часу нельга ігнараваць той факт, што ў выніку разгорнутай з энтузіязмам збіральніцкай работы было зафіксавана шмат каштоўнага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу.

Прыкладам таго матэрыялу служыць тэкст "Чайкі" – пераладжэнне песні ваенных маракоў часоў руска-японскай вайны "Варяг", якой уласцівы выключны трагізм і пафас героікі. Паводле А. Паповай, сюжэт суадносіцца з падзеямі адступлення атрадаў генерала Сяменава з Забайкалля ў Маньчжурыю пасля баёў з бальшавікамі, якія падышлі на дапамогу партызанам. Гэты першы надрукаваны тэкст "Чайкі" няпоўны і дэфектны, у ім адлюстравана толькі "ядравая вобласць сюжэту" [4]: Не вейтися, белыя чайки, / Куда же вам больши слетать, / Летите в далекая моря, / Несите печальную весть: / Там враг Семенов ваюить, / С васьмью партизанским палком, / Патроны уш все на исходи, / Снарядов савсем ужи нет, / Бросил катамку в абози, / А сам беспарятку бежал [5, с. 34–35]. Кантамінацыя зачына лірычнай песні і эпічнай часткі зацямняе сэнс: калі дапусціць, што лірычны герой – партызан, то нелагічна трактуюцца ўцёкі пераможанага ім праціўніка як "печальная весть". Таксама незразумелы сэнс словазлучэння "васьмью партизанским палком": мясцовыя апалчэнцы са старавераў наўрад ці фарміравалі такія вайсковыя фарміраванні як полк. Аднак для нашага даследавання важна тое, што публікацыя 1926 г. у навуковым часопісе "Сибирская живая старина" не рэдагаваная, захоўвае асаблівасці мовы інфарматара і аўтэнтычныя, у тым ліку дэфектныя, строфы.

[22] Верхняудзінск – пасля 1934 г. Улан-Удэ.

[23] У 2001 г. культурная прастора і вусная культура сямейских старавераў Забайкалля былі ўнесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

[24] Пазней у выніку змены палітычнай кан'юнктуры Г. М. Сямёнаў дзейнічае як белагвардзейскі *атаман*.

[25] У 1923–1930 гг. М. К. Азадоўскі працуе ў адным з навуковых цэнтраў ў галіне рускага фальклору – Іркуцкім дзяржаўным універсітэце, на працягу 1924–1925 гг. з'ўляецца рэдактарам часопіса "Сибирская живая старина". Экспедыцыйнай рабоце прысвечана яго праца "Беседы собирателя. О собирании и записывании памятников устного творчества применительно к Сибири" (1924).

Пазней у савецкай навуцы на дзесяцігоддзі ўсталюецца практыка рэдагавання і перапрацоўкі экспедыцыйных матэрыялаў для іх публікацыі.

На яшчэ адну публікацыю "Чайкі" 1920-х гг. указвае М. Друскін, гэта больш дасканалы варыянт, змешчаны ў фальклярыстычным нарысе А. Георгіеўскага 1929 г. Сюжэт пра смерць атрада сібірскіх партызан, якія не здаліся белым палкам цікавы тым, што не транслюе савецкую ідэнтычнасць партызан, а фіксуе толькі яе пераходны момант. Партызаны-апалчэнне яшчэ паўстаюць як аўтаномная сіла на арэне гісторыі: В далекой восточной долине / Врагом наш отряд окружен. / За правду там бьются партизаны / Совместно с советским полком [6, с. 93]. Варыянт "Чайкі" са зборніка "Красноармейский фольклор» (1938), які ўпершыню ўбачыў свет у 1929 г. ва Уладзівастоку, таксама захоўвае гэту гістарычную акалічнасць [7, с. 124].

Аднак у 1930-я гг. інтэрпрэтацыі песень часоў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны мяняюцца. У савецкай навуцы і культурнай практыцы сфарміравалася сістэма ідэалагічных установак і рэгулятываў, якія імплементавалі новую савецкую ідэалогію ў акадэмічную сферу. Фалькларысты АН СССР афіцыйна дэкларавалі неабходнасць рэвізіі і крытычнага пераасэнсавання дакастрычніцкіх, буржуазных метадалогій і стварэння тэорыі фалькларыстыкі на аснове марксізму-ленінізму. Гэта азначала, што палявыя матэрыялы будуць праходзіць цэнзуру і, калі трэба, нават канструявацца ў адпаведнасці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

У 1935 г. яшчэ адзін варыянт "Чайкі" выдаў будучы кампазітар і заснавальнік савецкай масавай песні А. Новікаў. Запісаная ў Наварасійску падчас экспедыцыі Саюза савецкіх кампазітараў па вывучэнні песень грамадзянскай вайны, яна адлюстроўвае ўжо новую героіку: Бьются проклятые буржуи / С советским четвертым полком [8, с. 220].

Рэвіталізацыя шэрагу старых салдацкіх песень адбылася ў гады Другой Сусветнай вайны, таму што, як пісала Г. Барташэвіч, менавіта яны сваім зместам і характарам найбліжэй стаялі да рэчаіснасці вайны [9, с. 107]. Гэты тэзіс пацвярджаецца, перш за ўсё, адносна ліраэпічных твораў, якія даволі прадуктыўна пашыраліся ў народнапесеннай традыцыі. Напрыклад, познетрадыцыйная балада пра санітарны атрад (Партызанская сястра)[26]; балада непазнаны муж вяртаецца з вайны (Там сонца закацілася за цёмныя ляса)[27]; ліраэпічная песня пра гібель сям'і (Ацец мой быў прыродны пахар / На нас напалі злыя немцы / Срэдзі Маньчжура і Кітая);[28] ліраэпічная песня пра смерць салдата на полі бою (Пад ракітаю зялёнай); ліраэпічная песня цяжка паранены салдат піша ліст да сваёй сям'і і інш. Да гэтага шэрагу належыць пашыраная сярод партызан і франтавікоў ліраэпічная песня пра гібель партызанскага атрада (Над возерам чаечка ўецца)[29], варыянты якой запісаны ў розных раёнах БССР.

Фактарам яе ўстойлівасці ў традыцыі ваеннага часу паслужыла, на нашу думку, адпаведнасць песеннага вобраза птушкі семантычнай сістэме фальклору. Міфасемантыка чайкі суадносіць яе з дзяўчынай, што маркіруе лірычны пачатак. Чайка, паводле народных уяўленняў, належыць да чыстых птушак, надзеленых рысамі трагізму ў сітуацыі раставання, праклёну і інш. [10, с. 527]. Такім чынам, зварот байца/партызана да чайкі метафарызуе шчырую споведзь і прадчуванне гібелі:

Над озерам чаечка ўецца, / Ей негдзе, бедняжачке, сесць[30],
Леці же ты, чайка, у край далёкій, / Несі ўсё печальную весць.
Скажы, што мы здзесь, на Дальнем Вастоке, / Наш полк акружон урагом.

---

[26] Варыянты балады «Партызанская сястра» апублікаваны ў выданнях «Песни сибирских партизан» (1935), «Красноармейский фольклор» (1938), «Творчество народов СССР» (1938) і інш.

[27] Варыянты балады "Там сонца закацілася за цёмныя ляса" апублікаваны ў выданнях "Песни русского народа: Собраны в губерниях Архангельской и Олонецкой в 1886 году" (1894), "Великорусские народные песни" (Т. 1. 1895), "Дореволюционный фольклор на Урале" (1936), " Материалы по истории песни Великой Отечественной войны" (1953) і інш.

[28] Аб выключнай устойлівасці ў народнай традыцыі гэтай ліраэпічнай песні, блізкай да жорсткага рамансу, сведчыць яе фіксацыя ў 1998 і 2002 г., зроблена беларускай даследчыцай А. Кукрэш ("Жорсткі раманс: фальклорныя песні", 2010).

[29] Бытавала падчас блакады Сталінграда («Литературный Сталинград», 1948).

[30] Тэкст даецца з захаваннем арыгінальнага напісання, пастаўлены знакі пунктуацыі.

Патроны ў нас на расходзе, / Снарады ўсе вышлі даўно.
Нам помачы ждаць неаткуда, / Пагібнуць нам здзесь суждзено.
Ой, там у лясу пад кусточкам / Баец маладой пагібаў.
Скланілся на грудзь сваю галоўкай / Он часта радных сваіх успамінаў.
Прашчай, мамаша і папаша / І ты, дарагая жана.
Я больше вас не ўвіджу / І вы меня – нікагда [11, л. 20].

Прыведзены варыянт уяўляе сабой кантамінацыю арыгінальнага сюжэта песні партызан Забайкалля 1920-х гг. з традыцыйнымі для народнай лірыкі матывамі смерці байца на полі бою і развітання з роднымі.

Найбольш позні з вядомых сёння варыянтаў "Чайкі" датуецца 1958 г., ён запісаны Г. Барташэвіч і К. Кузняцовай падчас Цэнтральна-Беларускай фальклорнай экспедыцыі ў в. Свяціха Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Відавочна, пры падрыхтоўцы да публікацыі ў акадэмічным выданні 1961 г. арыгінальны тэкст[31] быў апрацаваны, як і ўсе матэрыялы аб вайне, якія выходзілі ў друк. Паводле афіцыйнай пазіцыі, фальклор вайны трактаваўся як "мастацкі летапіс жыцця і барацьбы беларускага народа ў гады фашысцкага нашэсця" [12, с. 51]. Можна меркаваць, што арыгінальны экспедыцыйны запіс Г. Барташэвіч быў перакладзены на рускую літаратурную мову, у яго ўведзена канкрэтызацыя сіл абаронцаў і праціўніка: Ой, там в лесу Белоруси / Наш полк был врагом окружен, / Там дрались проклятые фашисты / С первым советским полком [13, с. 182].

Такім чынам, навуковы каментар сюжэтнага інварыянту лірычнай песні пра смерць партызанаў "Чайка", разгледжаны ў шасці варыянтах, зафіксаваных у перыяд з 1924 па 1958 гг., даказвае тэзіс аб рэпрадукцыі ў беларускай народнапесеннай традыцыі Другой сусветнай вайны ўзораў салдацкай песні часоў грамадзянскай вайны. Вызначаная з доляй умоўнасці геаграфія варыянтаў дазваляе сцвярджаць, што ў беларускі фальклор былі прыўнесены запазычанні з познетрадыцыйнай рускай народнапесеннай традыцыі, сфарміраванай на Далекім Усходзе ў 1920-я гг. Гэта абумоўлена поліэтнічным характарам супольнасці, у якой бытавала народная песня ў часы вайны. Сюжэтная традыцыя "Чайкі" з'яўляецца даволі ўстойлівай, аднак у позніх рэпрадукцыях назіраецца кантамінацыя матываў і дынаміка ў кірунку павелічэння лірычнай экспрэсіі.


1. Гусев, В.Е. Народное творчество в годы Второй мировой войны и задачи его исследования / В.Е. Гусев // Советская этнография АН СССР. Ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. – М.: Наука. 1980. – № 4. – С. 3–11.
2. Барташэвіч, Г.А. Традыцыйная народная песня ў беларускай народнай творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны / Г. А. Барташэвіч // Праблемы сучаснага беларускага фальклору. Рэд.: П. Ф. Глебка (і інш.). Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – С. 99–113.
3. Друскин, М. С. Собрание сочинений : в 7 т. / М. С. Друскин. Т. 5 : Русская революционная песня / сост. и коммент. С. В. Подрезовой. Спб.: Композитор. – 2012. – 795 с.
4. Левинтон, Г. А. "Интертекст" в фольклоре [Электронный ресурс] / А. Г. Левинтон // Фольклор и постфольклор: структура, типология, семиотика. – Режим доступа: https://www.ruthenia.ru/folklore/levinton1.htm. – Дата доступа: 30.11.2019.
5. Попова, А. Песни партизан / А. Попова // Сибирская живая старина / Восточно-Сибирский отдел РГТ. – Иркутск: ВСОРГО. 1926. – Вып. 1 (1). – С. 29–37.
6. Георгиевский, А. П. Русские на Дальнем Востоке. Фольклорно-диалектологический очерк. Вып. IV. Фольклор Приморья. / А. П. Георгиевский. – Владивосток : Тип. Гос. Дальневост. ун-та, 1929. – 114 с.
7. Красноармейский фольклор / Сост. В. М. Сидельников. – М.: Советский писатель, 1938. – 208 с.
8. Друскин, М. С. Указ. праца. С. 220.
9. Барташэвіч, Г.А. Указ. Праца. С. 107.
10. Гура, А. В. Символика животных в славянской народной традиции / А. В. Гура. – М.: Индрик, 1997. – 910 с.
11. БДАМЛМ. Фонд 349. Воп. 1. Спр. 87. Сш. 2.
12. Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны / Рэд.: П.Ф. Глебка (і інш.). – Мінск: Выд. Акадэміі навук БССР, 1961. – 618 с.


[31] Захоўваецца: Архіў ІМЭФ, ф. 8, воп. 1, №№ 14, 15 і інш.

13. Тамсама. С. 182.

# CIVIL WAR PLOT REPRODUCTION IN THE BELARUS FOLK-SONG TRADITION

***Nastassia Hulak***
*PhD Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus*
*rudolfina.hulak@tut.by*

**Summary:** The work analyses the development of “The Seagull” – a traditional Belarusian Second World War partisan plot. It is being proved that the song appeared through borrowing from the Russian folk song traditionin from the Far East that dates back to the 1920s. The representation of the song in folklore collections demonstrates the domination of a lyrical component in plot development and that ideological approaches have been in place in Soviet publications of the war folklore

***Keywords: folklore studies, song, The Second World War, the Civil War, the Far East, a seagull***